# Волаты нацыі



*Да 120-годдзя з Дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа*



Янка Купала і Якуб Колас – найвялікшыя вяршыні нашай нацыянальнай культуры. Іх проста немагчыма ўявіць паасобку, настолькі знітаваны ў адзінае іх душы, жыццёвыя і творчыя пазіцыі.

Зоркі Янкі Купалы і Якуба Коласа, якія сваім невыказным святлом асвятлілі цярністы бальшак змагання і незалежнасці, ярка зззялі на самым пачатку мінулага стагоддзя. У сваіх творах яны на ўвесь свет голасна заявілі пра багатую і трагічную гісторыю беларусаў, пра іх людскасць, пра тое, што яны хочуць «людзьмі звацца».

Духоўнае адзінства выдатных беларускіх песняроў акрэслена вызначыў Кандрат Крапіва: «Янка Купала і Якуб Колас – два шчырыя сябры, два волаты беларускай літаратуры, яе гордасць і слава. Іх вялікая дружба пачалася ў бурныя гады рэвалюцыі 1905 года, калі яны, маладыя і мужныя, упершыню выйшлі на літаратурную арэну, каб змагацца за свабоду і шчасце беларускага народа, якому яны прысвяцілі ўсё сваё жыццё...».

Таленты Янкі Купалы і Якуба Коласа былі такія магутныя і ўсеабдымныя, што ім аказалася пад сілу надзвычай поўна і глыбока адлюстраваць жыццё працоўных мас Беларусі пачатку XX ст., стварыць велічны вобраз народа, што ўзняўся да свядомай гістарычнай дзейнасці.

Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа несла ў сабе высакародныя думы, шчырыя пачуцці, народныя спадзяванні.

Такая якасць выявілася з першых публікацый песняроў: 15 мая 1905 года ў газеце «Северо-Западный край» з'явіўся верш Янкі Купалы «Мужык», крыху пазней, 1 верасня 1906 года, газета «Наша доля» надрукавала верш Якуба Коласа «Наш родны край». Творы выклікалі вялікі грамадскі рэзананс, асабліва ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі. А калі ў Пецярбургу ў выдавецтве «Загляне сонца і ў наша ваконца» выйшла паэтычная кніга Янкі Купалы «Жалейка» (1908), яна адразу ж была забаронена, таму што са старонак набатна гучаў голас паэта-дэмакрата. У цэнтры першага зборніка – гаротны селянін-працаўнік, які пачынае ўсведамляць сваю чалавечую годнасць. Ён пратэстуе супраць царскага самадзяржаўя. У кніжцы гучыць матыў барацьбы з царызмам, вера ў заўтрашні дзень беларусаў. Вось чаму кніга прызнавалася

антыдзяржаўнай, у ёй «нельга не заўважыць адкрытага ўзбуджэння да дзеянняў яўна бунтаўнічых...», – як пісалася пракурору С-Пецярбургскай судовай палаты аб налажэнні арышту на зборнік «Жалейка».

У 1910 годзе з творчасцю Янкі Купалы пазнаёміўся Максім Горкі. Асаблівую ўвагу звярнуў ён на паэму «Адвечная песня» (1910). Ён пісаў: «У Купалы ёсць невялікая паэма «Адвечная песня». Вось бы перакласці яе на вялікарускую мову. Вельмі цікавая з'ява... Слаўная рэч». Нездарма ж Максім Горкі натхнёна перакладзе на рускую мову «А хто там ідзе?», назваўшы верш Янкі Купалы гімнам беларускага народа.

«Цікавым з'явішчам у беларускай пісьменнасці апошняга года была кніжка Якуба Коласа «Песні-жальбы» (1910). Не ў пекнасці формы, мовы ці малюнку хаваецца цэннасць яго вершаў, але ў праўдзівай – далёкай ад усякага фальшу – любові да бацькаўшчыны; гэтая любоў, як цудоўная жывая вада ў казках, ажыўляе іх і робіць роднымі, блізкімі ўсякаму, у кім яшчэ ёсць душа жывая, хто не забыўся аб долі свайго народа» (Максім Багдановіч. Глыбы і слаі).

Якуб Колас выступіў у літаратуры перш за ўсё як паэт сацыяльнай тэмы, але ён ніколі не быў абмежаваным мастаком слова. Яго цікавіла самае шырокае кола пытанняў, так ці інакш звязаных з дзейнасцю чалавека. Вось чаму ў сваіх дакастрычніцкіх вершах ён даў яскравыя замалёўкі жыцця і быту працоўнага беларуса, а адначасова і роднай прыроды.

Паказ прыроды, раскрыццё яе непаўторнага хараства мелі выключна важнае значэнне, таму што толькі ў пачатку XX ст. прырода становіцца прадметам эстэтычнага адлюстравання ў беларускай літаратуры. І Якуб Колас з'яўляецца адным з найбольш таленавітых майстроў пейзажу, на што звярнулі ўвагу М. Багдановіч і А. Пагодзін.

Вось што пісаў прафесар Харкаўскага універсітэта А. Пагодзін у артыкуле «Беларускія паэты»: «Зборнік «Песні-жальбы» Якуба Коласа самой сваёй назвай вызначае пануючы тон яго вершаў. Але змест іх больш складаны, чым у Янкі Купалы. Тут пераважаюць карціны, часам такія прыгожыя і паэтычныя, што нехаця спыняешся над імі. Якуб Колас з'яўляецца сапраўдным паэтам, які ўмее знаходзіць свае словы для даўно апісаных вобразаў...».

Максім Горкі ў лістах да сваіх сяброў А. Чаромнага і М. Кацюбінскага з радасцю і захапленнем пісаў пра беларускіх песняроў, называў іх сапраўды народнымі паэтамі.

Пазнейшыя паэтычная кнігі Янкі Куалы «Гусляр», «Шляхам жыцця», «Спадчына», непараўнальныя паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», «Сымон-музыка», «На шляхах волі», дзівосная трылогія «На ростанях», жыццядзейныя, рамантычныя, напісаныя ўзлётнымі, відушчымі сэрцамі, яшчэ раз засведчылі, КАГО мела ў асобах Янкі Купалы і Якуба Коласа беларуская літаратура.

Высокае майстэрства і своеасаблівая непаўторнасць мастацкіх вобразаў купалаўскай і коласаўскай паэзіі выклікалі да яе зацікаўленасць у шырокіх літаратурных і навуковых колах Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Чэхаславакіі...

Гістарычная заслуга Янкі Купалы і Якуба Коласа перад беларускім народам у тым, што яны зрабілі родную літаратуру дзейснай зброяй народа ў барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае разняволенне.

Іх вялікі талент быў наватарскім па сваёй прыродзе. Яны смела пашыралі жанравыя магчымасці літаратуры, абнаўлялі, узводзілі на вышэйшую ступень паэтыку нацыянальнага вершаскладання, былі пачынальнікамі беларускай рэалістычнай прозы, драмы, камедыі, эпічнай рамантызаванай паэмы.

З прыходам у літаратуру Янкі Купалы і Якуба Коласа рассунуліся яе далягляды, надзвычай вырасла культура мастацкага слова, быў пакладзен трывалы падмурак сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Янка Купала і Якуб Колас вывелі нашу літаратуру за рамкі нацыянальнай абмежаванасці, узнялі яе на вышыню развітых літаратур свету, зрабілі яе здабыткам агульначалавечай культуры.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Янка Купала і Якуб Колас актыўна ўключыліся ў літаратурнае і грамадскае жыццё маладой краіны. Сваёй творчасцю яны выявілі велічны дух народа, вызваленага ад царскага прыгнёту.

Яны ўслаўлялі народную прагу да нацыянальнага Адраджэння, да светлых парыванняў у будучыню сваёй шматпакутнай Зямлі. Яны свята верылі ў шчаслівую зорку вялікай Праўды і Любові да працоўнага чалавека, носьбіта самых найлепшых духоўных якасцяў у гістарычнай прасторы і часе.

Тое, што зроблена нашымі слаўнымі песнярамі, не падлягае ніякаму вымярэнню.

Пройдуць гады і стагоддзі. Бессмяротная спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа будзе жыць вечна, натхняць нашчадкаў на вялікія добрыя справы дзеля роднай Бацькаўшчыны.

**А.М. Канапелька**

УДК 882.6 (092)

**К.С. Карнялюк**

# Мастацкая прырода коласаўскай эпічнай сістэмы

Мастацкая прырода класічнай коласаўскай эпічнай сістэмы – адна з самых стрыжнявых праблем сучаснага літаратуразнаўства і коласазнаўства. Яна атрымала досыць глыбокае асвятленне ў манаграфіях даследчыкаў [1-5]. У артыкуле мы паспрабуем шмат у чым па-новаму раскрыць складаны і супярэчлівы працэс ліра-эпічнага напаўнення прозы, спасцігнуць мастацка-філасофскую глыбіню трылогіі Я. Коласа «На ростанях».

Пошукі патрэбнага сінтэзу лірыкі і эпасу, калі лірызм не механічна далучаецца да эпічнай плыні празаічнага твора ў форме лірычных адступленняў, а, «як хімічны састаў, цалкам насычае сабою апавяданне» (У. Дняпроў), былі распачаты беларускімі празаікамі ў жанры апавядання. Гэта ў пэўнай ступені аблегчыла работу раманістаў у 1920-я гады, хоць, зразумела, для рамана трэба было шукаць сваю раманную меру сінтэзу.

Трылогія Я. Коласа «На ростанях», не страчваючы сваёй арыентацыі на эпічнасць, адчувала цягу да больш поўнага самараскрыцця асобы, асобы Лабановіча, імкнулася пазбавіцца ад залішняга рацыяналізму. У празаіка мы назіраем само пераасэнсаванне паняццяў лірызму і эпічнасці. Лірычнае, з уласцівым яму суб'ектыўным спосабам адлюстравання рэчаіснасці, не адхіляе, а, наадварот, шукае шляхі, якія б звязалі яго з эпічнай манерай апавядання. Эпічнае ў сваю чаргу становіцца іншым, выяўляецца ў больш цэласным гістарызме, у імкненні да большай філасафічнасці, псіхалагізацыі, якія адкрывалі магчымасць падключэння да агульначалавечых праблем. У якасці яскравай асаблівасці пісьменніцкай манеры Я. Коласа адзначым і адзінства ў прозе суб'ектыўна-лірычнага ўзнаўлення рэчаіснасці і яе аб'ектыўна-аналітычнага асэнсавання. Даследчыкі творчасці празаіка ўсведамляюць, што непаўторнасць яго мастацкай сістэмы – у своеасаблівым сінтэзе лірычнага і